# ВНУ ПЕРШАГА ПАТОКУ ЗАВЯРШЫЛІ ЗАЛІЧЭННЕ ПЕРШАКУРСНІКАЎ НА БЮДЖЭТ І ПЛАТНЫЯ АДДЗЯЛЕННІ

**Праз некалькі дзён будзе вядома агульная колькасць паступіўшых у ВНУ сілавых ведамстваў і творчыя ВНУ. Аб гэтым расказала кансультант аддзела вышэйшай адукацыі Мінадукацыі Беларусі Марыя КАРПЕНКА.**

У гэтым годзе, нягледзячы на тое, што абітурыенты маглі назіраць увесь ход уступнай кампаніі на спецыяльных экранах, а таксама ў глабальнай сетцы на сайтах ВНУ, конкурсы ўсё ж такі былі, і немалыя. Так, напрыклад, у Ваенную акадэмію Міністэрства абароны агульны конкурс па ВНУ склаў 2,1 чалавека на месца. У Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў агульны конкурс быў 2,9. Пры гэтым на спецыяльнасць «судовая экспертыза» конкурс склаў 4,3 чалавека на месца. А вось у Камандна-інжынерным інстытуце МНС агульны конкурс быў 4,2 чалавека на месца, у Гомельскім інжынерным інстытуце МНС — 5 абітурыентаў прэтэндавалі на адно студэнцкае месца.

Сярэдні конкурс па Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў склаў 3,2 чалавека на месца. Прычым, ад 5 да 8 абітурыентаў прэтэндавалі на розныя напрамкі спецыяльнасці «дызайн». У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі сярэдні конкурс склаў 1,2 чалавека на месца, а ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў — 2,4 абітурыента прэтэндавалі на кожнае званне студэнта.

**БЕЛТА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ